## СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ



# Восень

Адшумела лета
Роснымі лугамі,
Апусцела поле,
Нівы адцвілі.

Праплываюць хмары
Нізка над стагамі,
І ляцяць у вырай
З крыкам жураўлі.



На рабіне скачуць
Шустрыя сініцы,
Пад дажджом намоклі
Клёны і дубы.

Наліліся сокам
Спелыя брусніцы,
І каля дарогі
Выраслі грыбы.

1. На якую тэму напісаны гэты верш? Вызначце яго настрой.
2. Якія малюнкі прыроды вы ўяўлялі ў час чытання твора? Раскажыце.
3. Што сведчыць пра надыход восені? Прачытайце адпаведныя радкі.



Правообладатель Национальный институт образования

4. Якія з пералічаных прыкмет восені можна назваць сумнымі? Якія выклікаюць радасць? Знайдзіце і прачытайце іх.
5. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша, захоўваючы адпаведны настрой і інтанацыю. Не забывайце вытрымліваць адпаведны рытм і рабіць паўзы.



**ПЯТРУСЬ БРОЎКА**

## Надыход восені

Вось і лета сышло,
Адспявалі калоссі,
Цяжка нам заўважаць,
Як з'яўляецца восень.

Непрыкметна зусім —
Прыплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.

Усплыве туманом
Над рачулкаю соннай,
Устрывожыць дымком
З пахам бульбы пячонай.





Правообладатель Национальный институт образования

Зачаруе агнём
Маладзенькай рабіны,
На адлёце крылом
Памахае буслiным.

А пасля,
А пасля
Ліст апошні сарвецца...
Ды не знаю, чаму
Ты мне, восень, па сэрцу!



1. Якія пачуцці выклікаў у вас верш Петруся Броўкі? Які настрой аўтара перададзены ў ім?
2. Што вы ўяўлялі ў час чытання твора? Раскажыце.
3. Як вы разумееце выразы: «лета сышло», «адспявалі калоссі», восень «прыплыве павуцінкай», «гляне жоўтым лістком»?
4. Назавіце словы, што абазначаюць дзеянні восені. Якія з іх ужыты ў пераносным сэнсе? Якія з іх «ажыўляюць» восень, робяць яе падобнай да жывой істоты? Знайдзіце і прачытайце гэтыя словы.
5. Ці падабаецца паэту восень? Пацвердзіце радкамі з верша.
6. Разгледзьце ілюстрацыі да верша (с. 30—31). Паразважайце, ці ўдалося мастаку перадаць настрой твора. Чаму вы так думаеце?



Правообладатель Национальный институт образования

## У свеце прыгожага

**1. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны мастака Сяргея Кавальчука «Хутка восень».**



**2. Адкажыце на пытанні.**

1) Ці спадабалася вам карціна? Чым?

2) Як выглядае рэчка? Неба? Трава? Дрэвы?

3) Па чым можна меркаваць, што гэта пачатак восені?

4) Ці сугучны верш Сяргея Грахоўскага «Восень» і карціна Сяргея Кавальчука? Што іх адрознівае?



Правообладатель Национальный институт образования

**Маўленчая размінка.** Прачытайце лічылку, правільна вымаўляючы гукі [дз’], [ч], [ш], [р], [ц’].

У лесе, дзе дубкі,
Выраслі баравікі —
Адзін, два, тры, чатыры, пяць...
Трэба ў кошык іх узяць.

*Васіль Жуковіч.*



***Прага́лінка*** — незарослае месца ў лесе, палянка.
(Нязвыклы) ***енк*** — стогн, крык.
***Наха́бнік*** — чалавек, які не мае сораму.
***Бурало́міна*** — зваленае бурай дрэва.
***Ква́піцца*** — мець жаданне, імкнуцца завалодаць чым-небудзь.

## РЫГОР ІГНАЦЕНКА

## Лістападнік

Неяк асеннім днём блука́ў я са стрэльбай па лесе.

У адным месцы пачуў нейкі нязвыклы енк. Здавалася, быццам нехта злёгку на ляльку націска́ў і тая падава́ла свой голас.

Я асцярожна падышоў да залацістага арэшніку і выглянуў з-за куста.



Правообладатель Национальный институт образования